# Веснік Камароўкі

Інфармацыйны бюлетэнь кааліцыйных дэмакратычных сіл Савецкага раёна №18(1)снежань 2007

## УЗГАДАЕМ,ШТО НАМ АБЯЦАЛІ

Як хутка выбіральнікі забываюць перадвыбарчыя абяцанні! Найважнейшая падзея апошняга часу, якая тычыцца развіцця сацыяльнай сферы Беларусі, падштурхнула звярнуцца да словаў прэзідэнта 6-гадовай даўніны, перад выбарамі 2001 г. Гаворка пра падпісаны ім 14 чэрвеня бягучага года закон № 239-З *"Пра дзяржаўныя сацыяльныя ільготы, правы ды гарантыі для асобных катэгорый грамадзян"*.

Узгадаем прадстаўленыя ў нумары "Советской Белоруссии" ад 6 верасня 2001 г. абяцанні з выступу А. Лукашэнкі "За моцную і квітнеючую Беларусь":

*"В центре внимания государственной политики по-прежнему останется человек. А главным критерием оценки работы власти будет повышение уровня и качества жизни народа…По-прежнему одной из забот государства будет социальная защита простого человека..Важнейшими задачами Александр Лукашенко считает также… развитие системы социальной защиты населения, проживающего на территориях, зараженных радионуклидами."*

А вось і "рэалізвацыя" абяцанняў ў законе пра скасаванне ільгот: "Людзі, якія перанеслі прамянёвую хваробу і сталі інвалідамі 1-2 груп у выніку катастрофы на Чарнобыльскай АЭС пазбаўляюцца наступных сацыяльных ільгот:

–бясплатныя лекі, прапісаныя рэцэптам;

–бясплатны праезд ад месца жыхарства да месца лекавання;

–50-працэнтавая зніжка на аплату паслугаў жыллёва-камунальнай гаспадаркі;

–беспрацэнтавы крэдыт на будаўніцтва жылля з выплатай 50 працэнтаў за кошт жытла."

Падпісаны закон часткова, альбо цалкам скасоўвае ільготы больш як 6 млн (!) чалавек, у тым ліку студэнтам, ліквідатарам аварыі на ЧАЭС, інвалідам, пенсіянерам, нават дзецям да трох гадоў. І гэта прытым, што 2007 год быў афіцыйна абвешчаны ў Беларусі Годам дзіцяці!

А. Лукашэнка задумаў скасавць ільготы ўжо даўно. Але леташнія выбары не дазволілі свёй задумай падзяліцца. Вось што прэзідэнт сам сказаў на прэс-канферэнцыі 12 красавіка 2007: "І абмяркоўваць тут няма чаго. Гэта льготы, якія ўжо маім рашэннем не дзейныя. Іх трэба проста сёння ўнесці ў закон, паравіць закон… Але ж гэта было непапулярна перад выбарамі. Тады я пайшоў насустрач парламентарам".

Як бачым, палітык згуляў на даверлівым беларускім народам ды звычайна кароткай памяці выбарцаў да перадвыбарных абяцанняў.

Папярэдне да падпісання прэзідэнтам праект закона быў ухвалены Палатай прадстаўнікоў парламенту, а неўзабаве і Саветам Рэспублікі. Адзінадушнасць дэпутатаў "кішэннага" парламенту, уласцівая савецкім часам, уражвае: "за" 101 дэпутат з 102 ніжэйшай палаты, "за" ўсе 47 дэпутаў палаты вышэйшай.

Але ж большасць з іх і былі абраныя дэпутатамі праз падтрымку чарнобыльцаў, ветэранаў баявых дзеянняў, інвалідаў – як раз тых слаёў насельніцтва, якім яны льготы сваім голасам скасоўваюць!

А вось яшчэ цытата з афіцыйнай газеты, пакінем яе без каментараў : *"Президент гарантирует, что за 5 лет пенсии будут повышены в два раза! Спокойно смотреть в будущее могут люди, пострадавшие от чернобыльской катастрофы, – они по-прежнему будут окружены заботой Президента. Всегда и везде чувствовать поддержку государства будут молодые люди."* [Советская Белоруссия №253 (21250), вторник 4 сентября 2001 года ]

.

**Уладзімір ГАМЗА**

## ДАЖЕ ИЗ ПРИВАТИЗИРОВАННОЙ КВАРТИРЫ СМОГУТ ВЫСЕЛИТЬ?

Как известно, в Беларуси отсутствуют законодательные возможности выселить за неуплату жилищно-коммунальных услуг определенные категории семей. Это, например, семьи, где воспитываются несовершеннолетние дети. Также невозможно выселить и собственников жилья.

Своеобразное решение проблемы предложил на заседании горисполкома первый заместитель председателя Мингорисполкома А. Кунцевич. "Жилищные ремонтно-эксплуатационные объединения Минска должны добиваться принятия судами решений о принудительной продаже приватизированных квартир, принадлежащих злостным неплательщикам за коммунальные услуги", – сказал он.

По словам А. Кунцевича, сообщает Белорусское телеграфное агентство, приватизированное жилье, наряду с другим имуществом, может быть описано судебными приставами с последующей продажей для погашения долгов: "Нужно создать прецедент, провести первый судебный процесс. Из вырученной суммы должны быть погашены долги, а на оставшиеся средства гражданин сможет купить себе жилье. Если нам, к примеру, откажет районный суд, необходимо обжаловать это решение и подавать иски в вышестоящие суды"·

Кунцевич поручил жилищно-коммунальным службам глубже анализировать причины отказа судов в исках о взыскании задолженности или выселении должников. Нужно более грамотно составлять исковые заявления, аргументированно выступать в суде, доказывать свою правоту, считает зампред Мингорисполкома.

Для решения вопроса с семьями, воспитывающими несовершеннолетних детей, А. Кунцевич также озвучил алгоритм решения проблемы: "Значительная часть злостных неплательщиков – неблагополучные семьи, имеющие несовершеннолетних детей. Мы не имеем права их выселять. Значит, надо лишать этих граждан родительских прав, забирать детей под опеку государства. Может быть, некоторые одумаются, устроятся на работу и начнут погашать долги, чтобы у них не отобрали детей".

Если рекомендации чиновника примут к сведению, не исключено, что это усугубит и без того непростую ситуацию с социальным сиротством в Беларуси, отмечает Хартыя'97. Кроме того, очевидно, что в Беларуси не решен вопрос с возмещением средств, затраченных на содержание детей горе-родителей в госучреждениях. Напом-. -ним, по декрету президента № 18 "О дополнительных мерах по государственной защите детей в неблагополучных семьях" родители, лишенные родительских прав, должны возмещать средства в бюджет за содержание детей. На данный момент полностью погасили задолженность лишь 52 родителя. При этом в стране – 17 580 человек, обязанных возмещать расходы на содержание детей, находящихся на государственном обеспечении.

Каким образом человек-должник ЖКХ и должник за содержание ребенка (как правило, речь идет о людях, в силу своего социального статуса зарабатывающих крайне мало) сможет погасить задолженности, оплатить текущие платежи, остается неизвестным. Собственно, как и то, не останутся ли декларируемые меры по восполнению задолженности ЖКХ лишь благими намерениями.

Очевидно, что проблема коммунальщиков Беларуси не только в том, каким образом выбивать деньги из неплательщиков, но и в самой системе ЖКХ, подв

**Алексей ЗАРЕЧНЫЙ**

## АДБУДЗЕЦЦА РЭКАНСТРУКЦЫЯ ПАРКУ ДРУЖБЫ НАРОДАЎ

Пра маштабную рэканструкцыю парку паведаміла "Комсомольская правда в Беларуси".

Згодна з праектам рэканструкцыі, пры ўваходзе з боку плошчы, збудуюць унікальны фантан у выглядзе вадзянога гадзінніка.

На ўваходзе з боку скрыжавання вуліц Кульман і Багдановіча мусіць з'явіцца паўкруглая арка з нацыянальнымі арнаментамі розных краін свету. Вялікая тэрыторыя парку будзе адведзеная для правядзення масавых і забаўляльных мерапрыемстваў.

У цэнтральнай частцы ўзвядуць новую эстраду з празрыстых канструкцый з тэнтавым пакрыццём. Танцпляц каля сцэны разлічаны на 5 тысяч чалавек. Побач з'явяцца тры невялікія кавярні, кожная з якіх можа прыняць да 100 чалавек.

Уздоўж вуліц Карастаянавай – Арлоўскай працягнецца траса для катання на роліках. У парку з'явяцца і невялікія спартовыя пляцоўкі для гульні ў міні-футбол і валейбол.

Дарэчы, зазвычай мінскія ўлады дазваляюць праводзіць пікеты палітычным партыям і недзяржаўным арганізацыям менавіта ў гэтым парку, размешчаным каля плошчы Бангалор. Ад цэнтру далей.

**Андрэй ГУДОВІЧ**

**Шаноўныя чытачы!**

Рэдакцыя бюлетэню апякуецца вашымі прапановамі наконт зместу наступных нумароў.

Свае артыкулы, водгукі й пажаданні, паведамленні й заўвагі просім дасылаць на электронную скрыню

**RuchKamarouka@gmail.com**

Калектыў "Весніка Камароўкі"

**"Веснік Камароўкі" віншуе чытачоў з святамі Калядаў і Новага году! Да сустрэчы ў 2008!**